Весці БДПУ. Серыя 2. 2018. № 4. С. 62–66

УДК 94(476):329.78-053.81

# МАЛАДЗЁЖНЫЯ ПРАЎРАДАВЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ І АБ'ЯДНАННІ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.)

**В. І. Крывуць,**
*кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін БарДУ*

Паступіў ў друк 04.09.18.

UDC 94(476):329.78-053.81

# YOUTH PROGOVERNMENT ORGANIZATIONS AND COMMUNITIES IN WESTERN BELARUS (1921–1939)

**V. Krivut,**
*PhD in History, Associate Professor of the Department of Social and Humanitarian Disciplines, of Baranovichi State University*

Received on 04.09.18.

Артыкул прысвечаны развіццю праўрадавага маладзёжнага руху ў Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. У 1920–1930-х гг. на тэрыторыі заходнебеларускіх ваяводстваў міжваеннай польскай дзяржавы быў створаны і дзейнічаў шэраг маладзёжных арганізацый, якія былі цесна звязаны з кіруючым «санацыйным» рэжымам: Стралецкі саюз, Саюз сельскай моладзі, Саюз маладой вёскі, Саюз польскай дэмакратычнай моладзі, Саюз польскага харцарства, Арганізацыя працуючай моладзі і інш. Усе яны актыўна ўдзельнічалі ў рэалізацыі афіцыйнай маладзёжнай палітыкі. Аднак эфектыўнасці працы ў маладзёжным асяроддзі перашкаджалі даволі складаныя адносіны паміж некаторымі з гэтых арганізацый. Галоўнай крыніцай напружанасці з'яўлялася канкурэнцыя на глебе прыцягнення новых членаў. Польскія ўлады імкнуліся ліквідаваць унутраныя антаганізмы. Гэта дасягалася праз уніфікацыю арганізацый вясковай моладзі, а таксама наладжванне цеснага супрацоўніцтва праўрадавых аб'яднанняў пры адначасовым захаванні іх арганізацыйнай самастойнасці.

*Ключавыя словы:* Заходняя Беларусь, «санацыйны» рэжым, маладзёжная палітыка, маладзёжны рух, міжваенны перыяд.

The article is devoted to the development of a pro-government youth movement in Western Belarus in the interwar period. In 1920–1930-ies in the territory of the western provinces of interwar Polish state there were established and operated a number of youth organizations that were closely associated with the ruling "remediation" regime: Streletski Union, the Union of Rural Youth, the Union of the young village, of the Polish Democratic Youth, the Union of Polish scouting, Organization of young workers etc. All of them are actively involved in the implementation of the official youth policy. However, the efficiency of the youth was hindered by rather complicated relations between some of these organizations. The main source of tension is the competition on the basis of attracting new members. The Polish authorities have sought to eliminate the internal antagonisms. This was achieved through the unification of the rural youth organizations, as well as the close cooperation of pro-government organizations, while maintaining their organizational autonomy.

*Keywords:* Western Belarus, "remediation" regime, youth policy, youth movement, interwar period.

Маладзёжныя арганізацыі з'яўляюцца важным інструментам сацыялізацыі маладога пакалення. Напрыклад, праўрадавыя аб'яднанні і саюзы адыгрываюць значную ролю ў рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі. Таму вывучэнне гістарычнага вопыту ў дадзенай сферы заўсёды будзе захоўваць актуальнасць. Гэта ў поўнай меры адносіцца і да развіцця праўрадавага маладзёжнага руху на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд. Дадзеная праблематыка, у тым ліку і пытанні ўзаемаадносін паміж асобнымі праўрадавымі маладзёжнымі арганізацыямі, якія дзейнічалі на заходнебеларускіх землях у час іх знаходжання пад польскай акупацыяй, не знайшла належнага адлюстравання ў айчыннай гістарыяграфіі. Што тычыцца польскіх гісторыкаў, то яны асноўную ўвагу надавалі вывучэнню развіцця маладзёжнага руху на непасрэдна польскіх землях. Тым не менш некаторыя аспекты дзейнасці шэрагу праўрадавых маладзёжных саюзаў на тэрыторыі Палескага ваяводства знайшлі адлюстраванне ў працах П. Ціхарацкага [1; 2]. Навагрудскае, Віленскае і Беластоцкае

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

ваяводствы засталіся па-за ўвагай польскага даследчыка. Такім чынам, задачай дадзенага артыкула з’яўляецца ліквідаваць прабел, які існуе ў айчыннай гістарыяграфіі і прааналізаваць даволі складаныя ўзаемаадносіны паміж праўрадавымі маладзёжнымі арганізацыямі і іх уплыў на рэалізацыю афіцыйнай маладзёжнай палітыкі на тэрыторыі заходнебеларускага рэгіёна ў 1920–1930-х гг. Гэта будзе садзейнічаць фарміраванню больш аб’ектыўнай карціны грамадска-палітычнага жыцця Заходняй Беларусі, а таксама мець практычную каштоўнасць у якасці прыкладу канкрэтнай дзейнасці ў сферы сацыялізацыі моладзі.

На тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд набыў шырокае развіццё праўрадавы маладзёжны рух. Тут дзейнічаў цэлы шэраг маладзёжных арганізацый і аб’яднанняў: Стралецкі саюз «Стралец», Саюз сельскай моладзі «Сеў» (ССМ «Сеў»), Саюз маладой вёскі (СМВ), Саюз народнай моладзі (СНМ), Саюз польскага харцарства (СПХ), «Перадавая стража» (ПС), Арганізацыя працуючай моладзі (АПМ), Саюз польскай дэмакратычнай моладзі (СПДМ), Легіён маладых (ЛМ), Саюз маладой Польшчы і інш. Усе яны ў той ці іншай ступені знаходзіліся пад ідэйным уплывам і кантролем «санацыйнага» лагера і атрымлівалі значную матэрыяльна-фінансавую і арганізацыйную падтрымку з боку дзяржаўнай адміністрацыі, сістэмы адукацыі і сілавых структур. Узамен праўрадавыя арганізацыі актыўна ўдзельнічалі ў рэалізацыі асноўных кірункаў дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі: ваеннай падрыхтоўкі моладзі, прафесійнага навучання маладога пакалення, ліквідацыі маладзёжнага беспрацоўя, барацьбы з уплывам палітычных праціўнікаў у студэнцкім асяроддзі. Акрамя ўсяго іншага, на тэрыторыі Заходняй Беларусі яны разгарнулі дзейнасць у сферы паланізацыі мясцовай моладзі.

Зразумела, што для найбольшай эфектыўнасці гэтай працы неабходна было наладжваць супрацоўніцтва ўнутры праўрадавага маладзёжнага руху. Пэўныя крокі ў гэтым кірунку рабіліся. Вядома, што члены «Стральца» і ССМ «Сеў» сумесна праходзілі курсы па ваеннай падрыхтоўцы і сельскагаспадарчым навучанні, якія арганізоўваліся дзяржаўнымі і грамадскімі структурамі [3, арк. 480]. Напрыклад, у маі 1933 г. паміж Палескім ваяводскім ССМ «Сеў» і «Стральцом» было заключана пагадненне аб супрацоўніцтве. Гэта пагадненне прадугледжвала сумеснае стварэнне і выкарыстанне святліц (клубаў), карыстанне іх інвентаром і абсталяваннем. Планаваўся сумесны ўдзел у спартыўных і культурных мерапрыемствах. Атрады ваеннай падрыхтоўкі, створаныя пры Саюзе сельскай моладзі, пераходзілі пад апеку павятовых камендантаў «Стральца», адначасова калектывы сельскагаспадарчай падрыхтоўкі Стралецкага саюза карысталіся паслугамі спецыялістаў ССМ «Сеў». Прадугледжвалася і стварэнне сумесных атрадаў ваеннай падрыхтоўкі і калектываў сельскагаспадарчага навучання ў выпадку, калі на месцах не было дастатковай колькасці членаў арганізацый для самастойнай дзейнасці ў дадзенай сферы [4, с. 14]. Адначасова ў гарадах Стралецкі саюз разам с АПМ арганізоўваў вярбоўку маладых беспрацоўных у працоўныя лагеры [5, с. 3].

У пачатку 1930-х гг. у Навагрудскім ваяводстве па ініцыятыве мясцовага ваяводы С. Свідэрскага праводзілася значная праца па каардынацыі дзейнасці праўрадавых маладзёжных арганізацый. Так, для наладжвання супрацоўніцтва паміж усімі «санацыйнымі» саюзамі па прапанове ваяводы была створана сталая ваяводская Міжсаюзная маладзёжная канферэнцыя імя А. Скварчынскага, якую ўзначальваў віцэ-ваявода. Пад эгідай канферэнцыі ў Наваельні дзейнічала Маладзёжная сядзіба імя С. Свідэрскага. Яна лічылася «ідэальнай тэрыторыяй рэальнага супрацоўніцтва арганізацый гарадской і вясковай моладзі». Дзяржаўныя структуры здолелі наладзіць на тэрыторыі ваяводства цеснае супрацоўніцтва АПМ, СПХ і «Перадавой стражы», а таксама саюзаў сельскай моладзі (ССМ і СНМ). Аднак прызнавалася, што паміж апошнімі двумя арганізацыямі існуюць пэўныя «антаганізмы», якія планавалася ліквідаваць шляхам уніфікацыі [6, с. 5].

Сярод вучняў сярэдняй школы дзейнічалі СПХ, пачатак якога быў закладзены яшчэ да Першай сусветнай вайны, і створаная ў 1932 г. «Перадавая стража». Неабходна адзначыць, што спачатку з’яўленне ПС разглядалася як небяспека для харцарства. Тым не менш кіраўніцтва СПХ заявіла, што займае добразычлівую пазіцыю ў адносінах да «Перадавой стражы» і лічыць, што «з’яўленне на тэрыторыі старшых класаў сярэдняй шко-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

лы новай арганізацыі выклікае здаровае спаборніцтва». Членам СПХ было дазволена са згоды іх кіраўніцтва ўдзельнічаць у працы ПС. Лічылася, што ўдзел выпрабаваных працаўнікоў у дзейнасці «Перадавой стражы» станоўча паўплывае на развіццё гэтай арганізацыі, дапаможа ёй пазбегнуць памылак, дзякуючы вопыту, які быў назапашаны СПХ [7, с. 2]. У цэлым, паміж СПХ і ПС не ўзнікала напружанасці, паколькі абедзве арганізацыі знаходзіліся пад пільным кантролем кіраўніцтва дзяржаўнай сістэмы адукацыі. Акрамя таго, «Перадавая стража» не стала масавай і не змагла саставіць сур'ёзнай канкурэнцыі СПХ.

У Віленскім універсітэце імя С. Баторыя таксама існавалі некалькі арганізацый, якія лічыліся праўрадавымі. Гэта былі СПДМ, ЛМ і «Дзяржаўная думка». Нягледзячы на заяўлены праўрадавы характар, ідэалагічныя пастулаты гэтых арганізацый адрозніваліся. Так, у пачатку 1930-х гг. у СПДМ узмацніліся анарха-сіндыкалісцкія настроі [8, с. 7]. Назіраючы за радыкалізацыяй дадзенага саюза, лідары «санацыі» стварылі ў якасці супрацьвагі яму новую арганізацыю – Легіён маладых [9, с. 128]. ЛМ карыстаўся даволі радыкальнай фразеалогіяй, але спачатку стаяў на «дзяржаўніцкіх» пазіцыях. Група «Дзяржаўная думка» прадстаўляла кансерватыўнае крыло віленскага праўрадавага студэнцтва [10, с. 27]. Ідэйныя супярэчнасці перашкодзілі наладжванню ўзаемадзеяння і стварэнню паўнавартаснай кааліцыі праўрадавых студэнцкіх арганізацый у Вільні. Акрамя таго, частка радыкальных кіраўнікоў віленскіх СПДМ і ЛМ у далейшым стварыла Саюз студэнцкай лявіцы «Фронт», які меў цесныя кантакты с кампартыяй і камсамолам Заходняй Беларусі. З іншага боку, «Дзяржаўная думка» таксама пачала цесна супрацоўнічала з праціўнікамі «санацыі», крайне правымі польскімі нацыяналістамі, у час выбараў кіраўніцтва арганізацыі студэнцкай узаемадапамогі [11, с. 2]. У выніку «санацыя» не мела значнага ўплыву сярод віленскага студэнцтва.

Даволі складанай была сітуацыя ў асяроддзі сельскай моладзі. Тут паміж асобнымі праўрадавымі арганізацыямі разгарнулася даволі жорсткая канкурэнцыя ці «барацьба за душы» маладога пакалення. У пачатку 1930-х гг. на тэрыторыі Віленскага, Беластоцкага і Палескага ваяводстваў дзейнічалі ваяводскія філіялы ССМ «Сеў». У Навагрудскім ваяводстве існаваў фармальна незалежны Саюз сельскай моладзі Навагрудскай зямлі. Сваё рашэнне захаваць незалежнасць ад цэнтральных органаў ССМ «Сеў» у Варшаве навагрудскі саюз тлумачыў неабходнасцю абараніць «маладую крэсовую вёску» ад «непажаданай і шкоднай барацьбы ў нездаровай атмасферы» [12, арк. 4]. Тым не менш дэклараваная самастойнасць была даволі адноснай. Так, напрыклад, Саюз сельскай моладзі Навагрудскай зямлі накіроўваў сваіх дэлегатаў на ўсе з'езды, канферэнцыі і курсы, якія арганізоўваў ССМ «Сеў». Ён таксама выкарыстоўваў і яго выдавецкія магчымасці, рэгулярна змяшчаючы на старонках варшаўскага часопіса «Сеў», афіцыйнага органа ССМ «Сеў», свае справаздачы [10, с. 65].

Адначасова ў пачатку 1930-х гг. у Навагрудскім ваяводстве пачалі ствараць гурткі Саюза народнай моладзі, яшчэ адной праўрадавай арганізацыі, якая імкнулася працаваць у вясковым асяроддзі. Гэта прывяло да барацьбы за арганізацыйныя ўплывы і выклікала незадаволенасць Саюза сельскай моладзі Навагрудскай зямлі. Яго кіраўніцтва ў катэгарычнай форме запатрабавала ад СНМ адмовіцца ад працы на тэрыторыі ваяводства, ліквідаваць свае гурткі ці перадаць іх ССМ Навагрудскай зямлі. Аднак нягледзячы на гэтыя патрабаванні, структуры СНМ працягвалі існаваць у Стаўбцоўскім, Баранавіцкім і Навагрудскім паветах. Дарэчы, падобная «барацьба за душы» разгарнулася паміж СНМ, з аднаго боку, і ССМ «Сеў» і Стралецкім союзам – з другога, у Беластоцкім ваяводстве [11, арк. 1–3].

Неабходна адзначыць, што праўрадавыя арганізацыі сельскай моладзі з'яўляліся ідэйна блізкімі, ставілі перад сабою падобныя мэты. Супадалі метады і формы дзейнасці гэтых аб'яднанняў. Іх канкурэнцыя толькі перашкаджала належнай рэалізацыі дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі. Таму польскія ўлады ўзялі курс на ўніфікацыю «санацыйнага» маладзёжнага руху на вёсцы.

Аднак першыя спробы гэтай уніфікацыі, праведзеныя на ваяводскім узроўні, скончыліся правалам. Так, навагрудская Міжсаюзная маладзёжная канферэнцыя імя А. Скварчынскага не здолела ліквідаваць «антаганізмы» паміж СНМ і Саюзам сельскай моладзі Навагрудскай зямлі. У Беластоцкім

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ваяводстве ў кастрычніку 1931 г. пад апекай ваяводы М. Жындрам-Касцялкоўскага быў праведзены аб’яднаўчы з’езд дэлегатаў мясцовых філіялаў ССМ «Сеў» і СНМ [12, с. 2]. Аднак ужо ў 1933 г. кіраўніцтва аб’яднанай ваяводскай арганізацыі падначаліла яе цэнтральным органам СНМ у Варшаве. У выніку адбыўся раскол і пачалося аднаўленне самастойных гурткоў ССМ «Сеў» [13, арк. 9].

У далейшым уніфікацыя набыла цэнтралізаваны характар. Нарэшце, у лістападзе 1934 г. быў створаны агульнапольскі Саюз маладой вёскі. У аб’яднаўчай нарадзе, акрамя іншых, удзельнічалі дэлегаты віленскага і палескага філіялаў ССМ «Сеў», ССМ Навагрудскай зямлі, навагрудскага і беластоцкага філіялаў СНМ [14, с. 72]. Рэалізуючы пастановы аб’яднаўчай нарады, былі праведзены ваяводскія і павятовыя з’езды, якія падтрымлівалі рашэнне аб стварэнні СМВ. У заходнебеларускіх ваяводствах яны прайшлі ў першай палове 1935 г. Уніфікацыя спрыяла арганізацыйнаму развіццю «санацыйнага» маладзёжнага руху на вёсцы. У другой палове 1930-х гг. СМВ з’яўляўся адной з самых вялікіх арганізацый міжваеннай Польшчы. У 1938 г. існавала 5950 яго гурткоў (171 037 членаў). З іх у Віленскім ваяводстве дзейнічала 412 (11 830 членаў), у Навагрудскім ваяводстве – 436 (12 980 членаў), Палескім – 360 (11 465 членаў) [15, с. 30].

У другой палове 1930-х гг. «санацыйны» рэжым працягваў мерапрыемствы па кансалідацыі праўрадавага маладзёжнага руху. У лютым 1937 г. правае крыло «санацыі» стварыла Лагер нацыянальнага аб’яднання (ЛНА), пры якім існавала Служба маладых. Аднак большасць уплывовых праўрадавых маладзёжных арганізацый не пажадала аб’ядноўвацца пад яе эгідай і імкнулася захаваць самастойнасць [16, с. 141, 197]. Напрыклад, кіраўніцтва СМВ заяўляла, што «ідэйна-выхаваўчыя арганізацыі моладзі павінны быць незалежнымі ад палітычных партый і груповак» [17, с. 35].

У кастрычніку 1937 г. кіраўніцтва Стралецкага саюза, Саюза польскага харцарства і Саюза маладой вёскі выдала сумесную дэкларацыю, «Акт аб’яднання ідэйных імкненняў моладзі». У дэкларацыі заяўлялася, што арганізацыі будуць кіравацца ў сваёй дзейнасці палітычнымі ідэямі і выхаваўчымі ўказаннямі маршала Ю. Пілсудскага. Адначасова дадзеныя саюзы салідарызаваліся з лозунгам «кансалідацыі нацыянальнай энергіі», абвешчаным маршалам Э. Рыдз-Сміглым. Галоўнай сваёй мэтай яны абвяшчалі «працу па будаўніцтве культурнай, гаспадарчай, палітычнай і ваеннай магутнасці Польскай Дзяржавы». Прызнаючы агульную мэту і адначасова прытрымліваючыся арганізацыйнай самастойнасці, вядучыя праўрадавыя арганізацыі пастанавілі скаардынаваць свае намаганні такім чынам, «каб не толькі выдаліць любыя спрэчкі і раздражненні ў сферы працы, але і выяўляць усюды пачуццё ідэйнага братэрства і сумесна выконваць тыя задачы, на якіх неабходна сканцэнтраваць энергію ўсяго маладога пакалення». Для дасягнення гэтага ствараласся Міжсаюзная каардынацыйная камісія польскіх маладзёжных арганізацый [18, с. 1]. Фактычна адразу ж да гэтай дэкларацыі далучылася і Арганізацыя працуючай моладзі [19, с. 1]. Неабходна адзначыць, што гэтая своеасаблівая канфедэрацыя праўрадавых маладзёжных арганізацый стварылася ў супрацьвагу ўніфікатарскім памкненням ЛНА і з’яўлялася сведчаннем расколу ўнутры лагера «санацыі». Аднак з іншага боку яна садзейнічала больш эфектыўнаму і цеснаму супрацоўніцтву вядучых «санацыйных» саюзаў моладзі, у тым ліку і на тэрыторыі заходнебеларускіх ваяводстваў. Дарэчы, можна зрабіць выснову, што «Акт» кастрычніка 1937 г. выкарыстоўваў вопыт, назапашаны ў пачатку 1930-х гг. праўрадавым маладзёжным рухам Навагрудскага ваяводства пад апекай ваяводы С. Свідэрскага.

Такім чынам, у міжваенны перыяд на тэрыторыі Заходняй Беларусі дзейнічаў цэлы шэраг маладзёжных арганізацый, якія знаходзіліся пад ідэйным уплывам «санацыі» і складалі аснову праўрадавага маладзёжнага руху. Узаемаадносіны паміж гэтымі саюзамі былі даволі складанымі, што магло сур’ёзна перашкаджаць эфектыўнай рэалізацыі афіцыйнай маладзёжнай палітыкі польскіх улад. Так, ідэйныя супярэчнасці паміж студэнцкімі арганізацыямі не дазволілі «санацыі» ўсталяваць свой уплыў у Віленскім універсітэце. Паміж арганізацыямі, якія дзейнічалі ў асяроддзі вясковай моладзі, нягледзячы на іх ідэйную блізкасць, узнікла канкурэнцыя на глебе прыцягнення новых членаў. Аднак улады імкнуліся пераадолець існаваўшыя супярэчнасці паміж «сваімі» ма-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

ладзёжнымі аб'яднаннямі. Гэта дасягалася праз уніфікацыю «санацыйных» саюзаў вясковай моладзі, а таксама праз наладжванне цеснага супрацоўніцтва паміж асобнымі арганізацыямі пры адначасовым захаванні іх самастойнасці.


Літаратура

1. *Cichoracki, P.* Związek Młodej Polski na Polesiu w latach 1937 – 1939 / P. Cichoracki // Rocznik Lubelski. – 2010. – T. XXXVI. – S. 93 – 113.
2. *Cichoracki, P.* Województwo poleskie 1921 – 1939. Z dziejów politycznych / P. Cichoracki. – Łomianki : LTW, 2014. – 486 s.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 242 п. Воп. 1. Спр. 305.
4. Sprawozdanie Poleskiego Wojewodzkiego Związku Młodzieży Wiejskiej za rok 1933–1934. – Brześć nad Bugiem, 1935. – 16 s.
5. Strzeleckie obozy pracy // Kurjer Wileński. – 1933. – 27 listopada. – S. 3.
6. Na odcinku prac młodocianych w Nowogródczyźnie // Obóz Młodych. – 1934. – № 21. – S. 5.
7. *Bar, L.* Echa Zjazdu Z.H.P. w Katowicach u malkontentów / L. Bar // Kurjer Wileński. – 1933. – 7 maja. – S. 2.
8. Związek Polskiej Młodzieży Demokratycznej wobec zagadnień społeczno-ustrojowych // Kurjer Wileński. – 1935. – 1 maja. – S. 7.
9. *Osiński, Z.* Janusz Jędrzejewicz – piłsudzyk i reformator edukacji (1885 – 1951) / Z. Osiński. – Lublin: Wydawnictwo UMCS, 2008. – 338 s.
10. *Pruszkowski, A.* Przewodnik społeczny / A. Pruszkowski. – Warszawa: Druk. P. Brzeziński, 1934. – 292 s.
11. Wybory do stowarzyszeń akademickich // Słowo. – 1937. – 13 marca. – S. 2.
11. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Ф. 1. – Воп. 9. – Спр. 516.
12. Konsolidacja wejskiego ruchu młodzieżowego w woj. Białostockiem // Głos ziemi Białostockiej. – 1931. – 20 października. – S. 2.
13. Archiwum Państwowe w Białymstoku (APB). – Zespół 47. – Sygnatura 89.
14. Połączenie Związków Młodzieży // Sprawy Wiejskie. – 1934. – № 1. – S. 72 – 73.
15. *Małolepszy, E.* Kultura fizyczna w działalności wiejskich organizacji młodzieżowych II Rzeczypospolitej / E. Małolepszy. – Częstochowa: Akademia im. Jana Długosza, 2015. – 242 s.
16. *Jędruszczak, T.* Piłsudczycy bez Piłsudskiego. Powstanie Obozu Zjednoczenia Narodowego w 1937 roku / T. Jędruszczak. – Warszawa: PAW, 1963. – 230 s.
17. Notatki // Przedownik wiejski. – 1938. – № 1. – S. 34– 36.
18. Akt zjednoczenia dążeń ideowych młodzieży // Strzelec. – 1937. – № 41. – S. 1.
19. O.M.P. przystąpiła do porozumienia Harcerzy, Strzelców i Młodej Wsi // Kurjer Wileński. – 1937. – 17 października. – S. 1.



References

1. *Cichoracki, P.* Związek Młodej Polski na Polesiu w latach 1937 – 1939 / P. Cichoracki // Rocznik Lubelski. – 2010. – T. XXXVI. – S. 93 – 113.
2. *Cichoracki, P.* Województwo poleskie 1921 – 1939. Z dziejów politycznych / P. Cichoracki. – Łomianki : LTW, 2014. – 486 s.
3. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 242 п. Воп. 1. Спр. 305.
4. Sprawozdanie Poleskiego Wojewodzkiego Związku Młodzieży Wiejskiej za rok 1933–1934. – Brześć nad Bugiem, 1935. – 16 s.
5. Strzeleckie obozy pracy // Kurjer Wileński. – 1933. – 27 listopada. – S. 3.
6. Na odcinku prac młodocianych w Nowogródczyźnie // Obóz Młodych. – 1934. – № 21. – S. 5.
7. *Bar, L.* Echa Zjazdu Z.H.P. w Katowicach u malkontentów / L. Bar // Kurjer Wileński. – 1933. – 7 maja. – S. 2.
8. Związek Polskiej Młodzieży Demokratycznej wobec zagadnień społeczno-ustrojowych // Kurjer Wileński. – 1935. – 1 maja. – S. 7.
9. *Osiński, Z.* Janusz Jędrzejewicz – piłsudzyk i reformator edukacji (1885 – 1951) / Z. Osiński. – Lublin: Wydawnictwo UMCS, 2008. – 338 s.
10. *Pruszkowski, A.* Przewodnik społeczny / A. Pruszkowski. – Warszawa: Druk. P. Brzeziński, 1934. – 292 s.
11. Wybory do stowarzyszeń akademickich // Słowo. – 1937. – 13 marca. – S. 2.
11. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Ф. 1. – Воп. 9. – Спр. 516.
12. Konsolidacja wejskiego ruchu młodzieżowego w woj. Białostockiem // Głos ziemi Białostockiej. – 1931. – 20 października. – S. 2.
13. Archiwum Państwowe w Białymstoku (APB). – Zespół 47. – Sygnatura 89.
14. Połączenie Związków Młodzieży // Sprawy Wiejskie. – 1934. – № 1. – S. 72 – 73.
15. *Małolepszy, E.* Kultura fizyczna w działalności wiejskich organizacji młodzieżowych II Rzeczypospolitej / E. Małolepszy. – Częstochowa: Akademia im. Jana Długosza, 2015. – 242 s.
16. *Jędruszczak, T.* Piłsudczycy bez Piłsudskiego. Powstanie Obozu Zjednoczenia Narodowego w 1937 roku / T. Jędruszczak. – Warszawa: PAW, 1963. – 230 s.
17. Notatki // Przedownik wiejski. – 1938. – № 1. – S. 34– 36.
18. Akt zjednoczenia dążeń ideowych młodzieży // Strzelec. – 1937. – № 41. – S. 1.
19. O.M.P. przystąpiła do porozumienia Harcerzy, Strzelców i Młodej Wsi // Kurjer Wileński. – 1937. – 17 października. – S. 1.


РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ